**Установа адукацыі**
**"Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"**

Факультэт беларускай і рускай філалогіі
*Кафедра беларускага мовазнаўства*

Латушкіна Дар'я Ігараўна

# СТРУКТУРНА-ЗМЕСТАВЫЯ АСАБЛІВАСЦІ "РУСКА-БЕЛАРУСКАГА СЛОЎНІКА" С. НЕКРАШЭВІЧА І М. БАЙКОВА

Дыпломная праца

Навуковы кіраўнік –
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт Дзятко Д.В.

Мінск, 2012

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# АНАТАЦЫЯ

Дыпломнае даследаванне **складаецца** з прынятых скарачэнняў, уводзінаў, двух глаў, заключэння і бібліяграфічнага спіса (54 пазіцыі). **Агульны аб'ём работы** – 58 старонак, з іх 53 старонкі асноўнага тэксту.

**Аб'ектам** даследавання з'яўляюцца лексікаграфічныя працы 20-30-х гг. XX ст., у прыватнасці "Расійска-беларускі слоўнік" С.Некрашэвіча і М.Байкова. **Прадметам** – асаблівасці арганізацыі лексікі ў структуры названага перакладнога слоўніка.

**Мэта дыпломнай працы** – комплексна даследаваць структуру і прынцыпы ўкладання "Расійска-беларускага слоўніка" С.Некрашэвіча і М.Байкова.

У дыпломнам даследаванні былі пададзены агульныя звесткі пра стан і развіццё беларускай лексікаграфіі ў першай палове XX стагоддзя, быў вызначаны *асноўны метадалагічны прынцып* утварэння беларускай тэрміналогіі і ўкладання слоўнікаў – прынцып уліку здабыткаў жывой народнай мовы, згодна з якім аснову для словатворчасці павінны складаць словы, выразы і выказванні з гутарак насельніцтва. Ад дадзенага прынцыпу былі выпрацаваны наступныя прынцыпы:

- ✓ прынцып утварэння неалагізмаў (выкарыстоўваўся пры ўмове, што ў народнай мове не было неабходных тэрмінаў);
- ✓ прынцып надання іншамоўным словам тэрміналагічнага значэння.

Таксама былі разгледжаны асноўныя тлумачальныя і перакладныя слоўнікі 1920-х – 30-х гадоў.

Упершыню сістэмна праведзена вывучэнне мега-, макра- і мікраструктуры "Расійска-беларускага слоўніка" С.Некрашэвіча і М.Байкова: апісана размяшчэнне структурных частак выдання; разгледжаны алфавітны, алфавітна-сістэматычны і сістэматычны (семантычны) спосабы арганізацыі матэрыялу; даследаваны тыповыя элементы слоўнікавага артыкула РБС (зона намінацыі, варыянтаў, эквівалентаў, семантычная інфармацыя ў РБС і зона памет).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ